Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 46 (639). Wilnia, Niadziela 8 Śniežnia 1935 h. Hod XI (XIX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Палітыка непрызнаваньня

Аказіяй пісаць гэты артыкул паслужыла нам «Słowo», орган польскіх віленскіх абшарнікаў. У гэтай газэціне дужа часта спатыкаем розныя выбрыкі пад адрасам беларускага народу, яго імкненьняў і яго інтэлігенцыі, а яшчэ часьцей спатыкаем у ёй звычайнае непрызнаваньне нашага народу, яго адраджэнскіх аспірацыяў і яго ў гэтым кірунку асягненьняў. Праўда, бывае і так, што «Słowo» памыліцца і напіша праўду, як гэта нядаўна (13.X.35) напісала аб БХД: „niestety, otwarcie przyznać trzeba, iż BChD jest jedyną na naszym terenie niezależną grupą inteligencji białoruskiej, nie pozostającą pod bezpośrednim wpływem czynników postronnych». Але гэта, відаць, проста прыпадак, бо звычайна ў гэнай газэціне спатыкаем палітыку непрызнаваньня беларусаў, як гэта было і нядаўна, у ваднэй з справаздачаў аб судзе над украінцамі, замяшанымі ў справу забойства мін. Перацкага.

Палітыкі непрызнаваньня беларусаў трымаюцца ня толькі польскія абшарнікі, але бадай 90 прац. польскай інтэлігенцыі, якая займаецца палітыкай і мае такі ці іншы ўплыў на грамадзкія справы.

Палітыка непрызнаваньня ёсьць сталай прыкметай псыхікі польскай нацыяналістычнай інтэлігенцыі. Калі прасьледзім нацыянальна-адраджэнскі рух украінскі і адносіны да яго польскіх палітычных кругоў, дык убачым, што гэныя адносіны заўсёды былі нэгатыўныя. Спагаднасьці ўкраінскаму адраджэньню агулам не спатыкаем ані ў польскай літаратуры, ані ў грамадзкай думцы, ані ў публіцыстыцы. Спатыкаем самае толькі непрызнаваньне, самую нэгацыю. Нават апошняя ўгода украінскіх ундаўцаў з польскім урадам так-жа не апёрта на прызнаваньні, бо пазытыўнага ў польска-украінскія адносіны, апрача можа якіх дробных спраў, ня ўносіць нічога. Больш таго — нэгацыя гэткая, дзякуючы агітацыі нацыяналістычнай інтэлігенцыі, удзяляецца нават народным масам.

Тое-ж самае бачым і ў вадносінах польска-літоўскіх. Калі прасьледзім адносіны польскай інтэлігенцыі да літоўскага адраджэнскага руху, дык там апрача нэгацыі, непрызнаваньня, крыўдных дацінак, а часам і звычайных нават зьнявагаў, сьветлага бадай не спаткаем нічога. Гэткія адносіны польскай інтэлігенцыі да літоўцаў, праз прэсу і «інтэлігэнцкую» апінію, аб чым добра ведаем, так-жа пашыраюцца сярод сялянскіх і работніцкіх гушчаў.

Вось-жа калі гэтак польская «інтэлігенцкая» апінія адносілася і адносіцца да адраджэньня ўкраінцаў і літоўцаў, дык ясная рэч, што ня можа яна быць іншай і да беларусаў. Непрызнаваньне, нэгаваньне, неспрыяньне і перашкаджаньне беларускаму адраджэнскаму руху — гэта штодзенны хлеб большасьці польскай „інтэлігенцкай“ апініі. Паводле гэнай польскай апініі, беларусаў няма, няма беларускай інтэлігенцыі, няма літаратуры, няма народнай сьведамасьці, няма, агулам гаворачы, нічога. Тымчасам усё гэта, калі не ў такіх разьмерах, як мы гэтага хацелі-б, у нас ёсьць. Ёсьць у народзе нацыянальная сьведамасьць, часта на дзіва вялікая, ёсьць інтэлігенцыя, ёсьць паэты, вучоныя, прафэсары, ёсьць літаратура. Праўда, усё гэта ў Зах. Беларусі заціснута, захавана, як-бы закансьпіравана, але затое жывое і поўнае надзеі на тое, што праўда пераможа і што «загляне сонца і ў нашаваконца». Ня мала чаго цікавага з беларускіх культурных здабыткаў спатыкаем такжа і ў Усходняй Беларусі. Гэтых фактаў нэгаваць нельга. Факты заўсёды астаюцца фактамі.

За адным заходам, гаворачы аб адносінах польскага да нас «інтэлігенцкага» грамадзянства, трэба яшчэ на адну рэч зьвярнуць нам увагу. У нэгацыі беларускага народу і яго адраджэнска-вызвольных натугаў дужа сумную іграе роль большасць польскага каталіцкага клеру. Здаецца нам, што нэгацыі да беларусаў, літоўцаў і украінцаў найбольш спатыкаем у тых асяродках, дзе ўсеўладна пануе польскі клер. Ня ведаем, як на тэрыторыі украінскай, але ў нас амаль нігдзе ні ў ваднын касьцеле ніколі не спаткаеце польскага ксяндза, каб ён у сваім казаньні тлумачыў сваім слухачом, што беларусы, літоўцы, украінцы, як агулам усякі народ, маюць поўнае права на сваё адраджэньне і каб на шырокіх падставах Эванэліі тлумачыў сваім слухачом патрэбу справядлівага ўзаемнага сужыцьця ўсіх гэтых народаў. Затое вы спаткаеце дужа часта казнадзеяў, як у Вільні, так і на правінцыі, якія з амбоны да беларусаў або літоўцаў гавораць казаньні ў духу польскага выключнага нацыяналізму.

Гэткая палітыка да няпольскіх у Польшчы народаў «інтэлігенцкага» грамадзянства, ведама, шкодзіць нам у тым значэньні, што спыняе тэмпо адраджэньня нашага народу. Спыняе, кажам, але ня нішчыць яго і ўнутрана яго консолідуе і больш дадае яму сілы. Помніцца нам, што за часаў царскіх у Расеі падобныя адносіны былі ўсей расейскай буржуазіі і ўсіх нацыяналістаў, як да вызвольна-нацыянальных імкненьняў розных народаў, так і да рэвалюцыйна-соцыяльных. Перамаглі, як ведаем, імкненьні паступовыя, вызвольныя.

Ня гледзячы на нэгатыўныя адносіны польскага „інтэлігенцкага“ грамадзянства да украінцаў, народ гэты сяньня ўжо фактычна настолькі дасьпеў і культурна і палітычна, што толькі чакае мамэнту — і напэўна хутка яго дачакае, — каб стацца сусім незалежным. Літоўскі народ, ня гледзячы на непрызнаваньне яго культурных і палітычных натугаў з боку таго-ж польскага грамадзянства і на розныя з яго боку перашкоды, народ гэты сяньня ўжо мае сваю дзяржаву.

Верым, што так будзе і з народам беларускім. Нічога тут не даканаюць ніякія непрызнаваньні нас і ніякая барацьба з намі розных масьцяў польскіх фашыстаў і нацыяналістаў.

У 15-тыя ўгодкі Бел. Студэнцкага Саюзу

Сёлета мінае 15 гадоў, як беларускія студэнты Віленскага Унівэрсытэту заснавалі сваю арганізацыю — *Беларускі Студэнцкі Саюз.*

У мінулую нядзелю 1 сьнежня сёлета гэты Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні сьвяткаваў юбілей 15 гадоў свайго існаваньня. Гэтая ўрачыстасьць адбылася ў наступным парадку.

Набажэнствы

А гадзіне 9 раніцы ў касьцеле сьв. Мікалая адпраўлена набажэнства, на якое прыбылі многія студэнты, каталікі і праваслаўныя, а так-жа прадстаўнікі старэйшага грамадзянства; падчас набажэнства хор сьпяваў беларускія рэлігійныя песьні. Пасьля набажэнства кс. Ад. Станкевіч сказаў глыбокага зьместу казаньне, у якім заклікаў беларускае студэнцтва, і агулам моладзь, на Хрыстовы шлях барацьбы за волю Беларускага народу.

А гадзіне 12 удзень у Пятніцкай царкве, у прысутнасьці таго-ж беларускага студэнцтва і прадстаўніцтва беларускага старэйшага грамадзянства, а. Краскоўскі адправіў малебен. Падчас набажэнства сьпяваў царкоўны хор, які ў канцы прапяяў беларускі царкоўна-рэлігійны гімн.

Акадэмія

А гадзіне 16 у залі Віленскага Унівэрсытэту пачалася ўрачыстая акадэмія. Народу зышлося многа — вялізарная заля была шчыльна запоўнена. Былі прадстаўнікі унівэрсытэцкіх уладаў, былі прадстаўнікі беларускага грамадзянства, былі студэнты беларусы, літоўцы, украінцы і інш. На фронтавай сьцяне вісеў удэкараваны беларускім нацыянальным бел-чырвона-белым сьцягам гэрб беларускага народу — Пагоня. За прэзыдыяльным сталом засеў урад Бел. Студ. Саюзу і ганаровыя сябры прэзыдыюму гэтай акадэміі. Акадэмію адкрыў кароткай, рэчовай, адпаведнай урачыстасьці, прамовай старшыня Саюзу студ. Мік. Шчорс.

Два рэфараты

Пасьля адкрыцьця акадэміі першы рэфэрат — інфармацыйна-справаздаўчы — чытаў малады студэнт. Трэба сказаць, што гэткі рэфэрат магчыма чытаць толькі ў крузе сваіх сяброў, дзе можа адбыцца дыскусія, але ніколі ня можна чытаць рэфэрату гэнага на ўрачыстай акадэміі, дзе ня бывае дыскусіі і выключаны ўсялякія папраўкі.

Другі рэфэрат, зусім адпаведны хвіліне часу і мейсцу, прачытаў студ. В. Тумаш; рэфэрат нажаль быў прачытаны так, што мала было яго чуваць.

Агулам, прамовы студэнтаў і абставіны на гэтай акадэміі выявілі моцныя ідэолёгічна-незалежніцкія настроі нашай студэнцкай моладзі. Словам, у нашай моладзі ідэя незалежнасьці Беларускага народу, абвешчаная актам 25 сакавіка 1918 году, углыбляецца і ўмацоўваецца.

Прывітаньні

На гэтай урачыстасьці віталі беларускіх студэнтаў і выражалі свае пажаданьні прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў і групаў, а такжа прадстаўнік літоўскага і украінскага студэнцтва. Ад імя Бел. Нац. К-ту вітаў інж. А. Клімовіч, ад Бел. Інст. Гасп. і Культуры кс. В. Гадлеўскі, ад Т-ва Бел. Школы грам. Р. Шырма, ад Рэдакц. Калегіі „Калосься“ кс. Ад. Станкевіч ад Літоўскага Студ. Саюзу студ. Ф. Чэніс, ад Украінскага студэнцтва студ. В. Дэцык, ад групы бел. абс. вышэйшых школ грам. В. Грышкевіч, ад рэд. „Шлях Моладзі“ рэд. Я. Найдзюк. Апрача вусных прывітаньняў было многа прывітаньняў пісьменных і тэлеграфічных.

Апрача вышменаваных віталі беларускіх студэнтаў др. Франук Грышкевіч і грам. Антон Луцкевіч. Абодвы гэтыя прывітаньні варты ўвагі. Грышкевіч — на зьдзіўленьне — у сваей прывітальнай прамове выявіўся, як фашыст! Луцкевіча-ж выступленьне было, як прысутныя зразумелі, асабістым ананімовым разрахункам з тымі, з каторымі так нядаўна ён працаваў у кірунку беларуска-польскай угоды, а з каторымі сваю дружбу скончыў нядаўна адбытым грамадзкім судом. Суд-жа, як відаць з яго прыгавору, у трэцім сваім пункце, аднолькава закваліфікаваў, як іншых, так і Луцкевіча.

Канцэрт

Пасьля прывітаньняў быў канцэртны аддзел. На вялікую ўвагу

24085

заслугоўвае народны беларускі танец „Юрачка“, які памастацку быў выкананы пад дырыжорствам мгр. Я. Хвораста. Далей была рэцытавана поэма Міхася Машары „Кастусь Каліноўскі,“ а Хор пад кіраўніцтвам гр. Р. Шырмы прапяяў некалькі прыгожа згарманізаваных беларускіх песьняў у дасканалым выкананьні. Канцэрт закончыўся мастацкім выкананьнем народнага танца „Лявоніха.“

Агулам кажучы, урачыстае сьвяткаваньне 15 угодкаў існаваньня Беларускага Студэнцкага Саюзу выклікала, за выняткам вышэй успамянутых недарэчнасьцяў, мілы і суладны настрой у прысутных. *п—к.*

Naša pieśnia

Naš karespandent z Paleśsia, hr. Zaduma, — wysłuchaŭšy wystupleńnie Choru hr.R. Šyrmy ŭ radyo dn. 21-ha listapada piša: — Najpaŭniejšy chiba dokaz isnawańnia ŭ našym narodzie mastackich wartaściaŭ, jakimi jon — harotny dy zmorany zmahańniem za swoj mataryjalny i nacyjanalny byt — moža na ŭwieś świet hanarycca, dajuć (čamu tak redka?!) wystupleńni Choru, asabliwa apošnija jaho suksesy ŭ radyo.

I dalej z zachopleńniem piša: —

Pieśnia! Rodnaja biełaruskaja, čarujučaja tajomnaj upajajučaj melancholijaj, abo rwučaja burnaj hulliwaściu, — pieśnia, što pływie na chwalach eteru ŭ kulturalny šyroki świet, chwatajučy usich za serca dy budziačy naležny respekt da biełaruskaj adradženskaj idei!...—

I pažadańni: —

Chaj-ža radaść heta padymie, ŭzmahutnić dy utrywalić wieru i nadzieju ŭ niedalokuju lepšuju budučyniu! Chaj pierarodzić razbudžany entuzyjazm u niaŭhasnuju systematyčnuju enerhiju!...

Dajcie razhonu, prastoru
Dremlučym u pieśni siłam!
—Drohnie zapor najmahutniejšy,
My ŭskałychniom i mahiłaj!...

. . . .

Šlach załaty praciarebim,
Zorna ŭzniasiomsia ŭ wysoty
Wyšaj niapraŭdy, niasławy,
Wyšaj pakutnych bałotaŭ!...
Moc swaju świetu pakažem...
Zdziwiacca starcy i dzieci:
Što znača mastackaja siła!
Što znača mocna chacieci!...
—o— (J. KUPAŁA).

—Dyk sława, češć i haračaja ŭdziačnaść niaŭtomnym našym pracaŭnikom adradženskim na niwie mastactwa, rodnaj pieśni!

Chaj žywie i raźwiwajecca Biełaruski Radiocentr u Wilni na čale z jahonym wysokazasłužanym Dyrektaram hram. Šyrmaj!!!—

Наступ латвійскага нацыяналізму на Беларусаў

Латвійскі часапіс „Jaunakas Žinas“ (№ 271, 28.XI.35) зьмяшчае такую зацемку: „Ліквідаванае таварыства“. Віцэміністр унутраных спраў А. Бэрдзінь загадаў ліквідавацца беларускаму культурна-асьветнаму т-ву „Беларуская Хата“. Ліквідаваньне павінен зрабіць урад успомненага т-ва ў працягу 3 месяцаў.“

Трэба ведаць, што т-ва „Беларуская Хата“ (Рыга) ёсьць найстарэйшай культурна-асьветнай беларускай установай. Сёлета абходзіла 10-лецьце свайго існаваньня. Цэнтраля т-ва ў Рызе. Т-ва мае свае аддзелы ў меншых гарадох і на правінцыі. Апошнімі гадамі концэнтравала амаль усё беларускае культурна-асьветнае жыцьцё у Латвіі. Загад аб ліквідацыі т-ва пэўнеж выклікае пачуцьцё абурэньня і пратэсту ня толькі ў кожнага шчырага Беларуса, але так-жа ў кожнага чэснага чалавека.

70-lećcie zabarony litoŭskaha druku

Sioleta ŭ žniŭni miesiacy minuła 70 hadoŭ ad taho času, kali rasiejskaja carskaja ŭłada była zabaraniŭšy litoŭski druk. Stałasia heta za časaŭ Muraŭjowa. Rasiejskija ŭradaŭcy: abrusiełу niemiec Hilferding i palak Mikucki paradzili Muraŭjowu dla litoŭskich drukaŭ užywać rasiejskija litary. Hetyja litary mieli dakončyć toje, što pačaŭ mieč. Rasiejskija ŭłady dumali, što litoŭcy, čytajučy druki rasiejskimi litarami, chutčej prywyknuć da Rasiei, nabiarucca rasiejskaha ducha i ŭreščie prymuć prawasłaŭje.

Drukawańnie hetkich „litoŭskich“ drukaŭ pačałosia pry Muraŭjowie i raźwiwałasia dalej pry jaho nastupniku hienerał-hubernatary Kaufmanie, jaki ŭ 1865 h. wydaŭ aficyjalnuju zabaronu drukawać i pradawać litoŭskija knižki łacinicaj. Hetuju zabaronu paćwierdziŭ ministr unutranych spraŭ i ŭreščie sam car Aleksandar II.

Litoŭcy, wydawanyja ŭładami druki hraždankaj, bajkatawali i šukali sposabu zdabyć sabie knižki takija, jakija im byli patrebnyja. Sposab hety chutka znajšli. U Prusii ŭ Tylžy pačali drukawać litoŭskija knižki i adtul pieranosić ich u Litwu, što była pad Rasiejaj. Na knižkach, wydanych u Tylžy, śpiarša stawili firmu drukarni Zawadzkaha ŭ Wilni, bo Zawadzki mieŭ prawa pradawać litoŭskija knižki, wydanyja jašče prad zabaronaj.

Rasiejcy śpiarša nie paznalisia i knižki išli šyroka ŭ narod. Ureščie adkryŭšy sakret, staranna ścierahli hranicy, adbirali knižki i palili, a tych, što knižki pieranosili, karali štrafam, wastroham i ssyłkaj u Sibir.

Zabarona trywała 40 hadoŭ. Za hety adnak čas zahranicaj było nadrukawana 1909 roznych litoŭskich drukaŭ. Rasiejcy-ž hraždankaj wydali tolki 41 druk. Praz 9 hadoŭ — ad 1891 da 1900 — rasiejskija žandary na pruskaj hranicy pieraławili litoŭskich drukaŭ 173.259.

Knižki, drukawanyja ŭ Prusii, byli pierawažna relihijnaha źmiestu. Ureščie ŭ tej-ža Prusii pačali wychodzić hazety ahulna narodnaha adradženskaha kirunku, jak „Aušra“ ŭ 1883, paśla „Varpas“, „Apžvalga“, „Ukininkas“ i inš. Hetyja hazety, tajna z zahranicy prynošanyja ŭ kraj, namaŭlali narod nia čytać knižak wydawanych uradam hraždankaj, damahacca dazwołu na swaje knižki, a kali damahańni nia buduć spoŭnieny, nie pasyłać dziaciej u rasiejskija školy, nie płacić padatkaŭ i h. d.

Zaklik hety litoŭskaj intelihiencyi da narodu swajo zrabiŭ. U narodzie paŭstaŭ wialiki prociŭrasiejski ruch. Ułady ŭbačyli, što čym bolš jany praśledujuć litoŭcaŭ za ich druki, tym bolš litoŭcy henyja druki čytajuć i pašyrajuć. Baraćba dla ŭradu stałasia prosta niemahčymaj. I woś ŭ 1904 h. nastupiŭ doŭha čakany dazwoł wydawać litoŭskija druki łacinskimi litarami.

40 hadoŭ barolisia litoŭcy za swaje kulturnyja prawy i ŭreščie wyjhrali. Baraćba była niaroŭnaja: z adnaho boku mahutnaja Rasieja z usim dziaržaŭnym aparatam, a z druhoha siarmiažny narod i žmienia intelihiencyi. Ale baraćba za praŭdu i sprawiadliwaść usiožtaki pieramahła i litoŭcy wyjhrali.

P. Ł.

Prezydent T. G. Masaryk ustupiŭ

Praf. Dr. Tamaš G. Masaryk 27 listapada siol. ustupiŭ dabrawolna z zajmanaha dahetul pasadu prezydenta Čechasławackaj Respubliki. Na hetym pasadzie prezydent Masaryk uradawaŭ biazźmienna ad 1918 h. i ŭstupiŭ dziela swajej staraści — maje 86 hadoŭ. Nastupnikam prezydenta Masaryka maje być dahetulašni jahony supracoŭnik i taksama biazźmienny ministr zahraničnych spraŭ ČSR Dr. F. Beneš.

З ГАЗЭТ

І яны не разумеюць.

Паўгода з лішнім пачаў выходзіць у Непокалянове (у Польшчы) штодзеньнік „Mały Dzieńnik“, які меў за заданьне быць узорам каталіцкага пагляду на жыцьцё. Час аднак паказаў, што і „Mał. Dz.“ каталіцкасьць (нават „кляштарная“!) ня вытрымоўвае пробы жыцьця і астаецца з яе толькі прыметнік „польскасьць“ у такім сэнсе, што яму мог-бы пазайздраваць нават „нябожчык“ Ян Обст. Здраджалася гэта ў „M. Dz.“ заўсяды, калі ён пачынаў гаварыць аб нацыянальных „меншасьцях“ у Польшчы. Гэтак выдаў сябе „M. Dz.“ і ў „Liście z Kresów Wschodnich“ у № 195, дзе, змонополізаваўшы для сябе „Boga i Ojczyznę“, зусім, не пахрысьціянску нават, адмаўляе гэта права для беларусаў. Найбольш аднак непакоіць „каталікоў“ з „M. Dz.“ тое, што:

„польскія банкі выстаўляюць на ліцытацыю зямлю польскага асадніка і абшарніка. Польская зямельная ўласнасьць катастрофальна корчыцца. Зямля дастаецца ў рукі варожага да дзяржавы элемэнту .. літоўскага, жыдоўскага і рускага“ (слова „беларус“ рэдакцыі „M. Dz.“ здаецца не пралазе праз горла).

Выхад з гэткай сытуацыі „M. Dz.“ бачыць у тым, каб польскі ксёндз, вучыцель і ўрадавец (самаўрад) падалі сабе рукі ў дальшай сільнейшай полёнізацыі непаддайных „Крэсаў“.

Старое гэта лекарства і бяссэнсоўнае. Польскі ксёндз і польскі вучыцель „працуюць“ на беларускіх землях гадоў ужо многа і дайшло да таго, што ніколі так не пуставалі сьвятыні і ня дзічэла ад бязчыннасьці моладзь, як гэта дзеецца цяпер. Дык ня тудою дарога!

Што ім баліць.

Той-жа „Mały Dziennik“ у № 196 у арт. „O uzdrowienie Szkoły Kresowej“ цьвердзіць даслоўна:

„уплыў польскай школы на Крэсах падае. Шаснаццаці гадовы хлапец, які нядаўна пакінуў школьную лаўку... лепш знае дату Незалежнасьці Беларусі, чым цэлую хронолёгію гісторыі Польшчы..Як вельмі баліць польскае сэрца, калі з вуснаў каталіцкай сельскай моладзі чуе словы: „Мы тут усе беларусы“.

Дык чаму так баліць „каталіцкае“ сэрца рэдактара „M. Dzieńnika“, што беларускае дзіця ці моладзь усьведаміла сабе ўжо сваю нацыянальную прыналежнасьць, ды што гэта моладзь знае важнейшыя даты з гісторыі свайго Народу?

Б. В.

Праект праграмы Беларускага Народнага Аб‘еднаньня

Падаём праект праграмы новай арганізацыі (абноўленай Б.Х.Д.) для дыскусыі. Справу назову і праграмы арганізацыі аканчальна вырашыць Рада Б.Х.Д. Тымчасова называем арганізацыю „Беларускае Народнае Аб‘еднаньне“ (БНА). Зацікаўленых просім у найхутчэйшым часе прысылаць свае ўвагі аб праекце праграмы Б.Н.А.

Вільня, 4.XII.35. *Прэзыдыюм Ц.К. Б.Х.Д.*

I. Галоўныя палітычна-грамадзкія мэты.

a) Б.Н.А., стоячы на прынцыпе самастанаўленьня народаў, імкнецца да самастойнасьці Беларускага Народу на ўсіх яго этнографічных землях, аб‘яднаных у незалежную дзяржаву;

b) Б.Н.А. імкнецца да таго, каб у незалежнай Беларусі быў створаны такі грамадзкі лад, які, апіраючыся на працы, грамадзкай роўнасьці і справядлівасьці, не дапускаючы да эксплёатацыі адных другімі, заспакойваў-бы палітычна-грамадзкія, культурныя і эканамічныя патрэбы грамадзян;

c) Б.Н.А. проціў дыктатуры капіталізму, фашызму і камунізму.

II. Шлях да мэтаў.

§ 2. Б.Н.А. да сваіх мэтаў ідзе:

a) дарогай арганізаваньня, усьведамляньня беларускага сялянства, работнікаў і інтэлігенцыі на грунце грамадзкай роўнасьці, справядлівасьці і беларускай народнай культуры. Дзеля гэтага Б.Н.А. закладае беларускія школы, народныя дамы, ладзіць лекцыі, рэфэраты, курсы, зьезды, выдае кніжкі, газэты і г. д.

b) Б.Н.А. праводзіць сваю дзейнасьць такжа на грунце палітычна-грамадзкіх установаў, выкарыстываючы тыя варункі, у якіх жыве Беларускі Народ,

c) Б.Н.А. урэшце, ідучы да сваіх мэтаў, змагаецца так-жа ўсімі іншымі магчымымі дастойнымі спосабамі.

III. Адносіны да суседніх і іншых народаў.

§ 3. Б.Н.А. лічыць сваім ідэалам, каб Беларускі Народ меў добрыя адносіны з усімі народамі на падставе ўзаемнасьці, роўнасьці і міжнароднай справядлівасьці.

IV. Палітычныя і грамадзкія правы.

§ 4. Б.Н.А. за роўныя правы для ўсіх грамадзян.

§ 5. Б.Н.А. за свабоду сходаў, друку, слова, сумленьня, арганізацыі таварыстваў і прафэсыянальных саюзаў.

§ 6. Б.Н.А. дамагаецца поўнай свабоды выбараў у дзяржаўныя і самаўрадавыя ўстановы на падставе агульнага, простага, тайнага, роўнага і прапарцыянальнага галасаваньня.

§ 7. Кожная нацыянальнасьць мае права карыстацца сваей мовай у агульна-грамадзкім і палітычным жыцьці.

V. Самаўрады.

§ 8. Б.Н.А. стаіць за тое, каб грамадзкія, культурныя і гаспадарскія справы мясцовага характару належалі да тэрыторыяльных, гаспадарскіх і прафэсыянальных самаўрадаў.

VI. Школа.

§ 9. Пачаткавае навучаньне абавязкавае для ўсіх на кошт дзяржавы, самаўрадаў або на кошт уласны грамадзян.

§ 10. Навука ў школах павінна адбывацца ў роднай бацькаўскай мове дзяцей.

§ 11. Навучаньне рэлігіі кожнага вызнаньня адбываецца ў дзяржаўных і прыватных школах так-жа ў роднай мове дзяцей.

§ 12. Школы прыватныя карыстаюцца такімі-ж правамі, як і дзяржаўныя.

§ 13. Б.Н.А. за пашырэньне школ земляробскіх, тэхнічных і агулам прафэсыянальных.

§ 14. Б.Н.А. за права і вольнасьць шырокай прасьветнай працы пазашкольнай (прасьветныя арганізацыі, чытальні, бібліятэкі, тэатр, народныя дамы, народныя унівэрсытэты і інш.).

§ 15 БНА за тое, каб закладаючы бурсы і інтэрнаты, а такжа вызначаючы стыпэнды і на кошт дзяржавы й самаўрадаў, дапамагаць дзецям сялян і работнікаў здабываць сярэднюю й вышэйшую асьвету.

VII. Рэлігія.

§ 16. Б.Н.А. за свабоду існаваньня рэлігіі і свабоду вызнаваньня.

§ 17. Б.Н.А. за тое, каб рэлігійныя ўстановы, у сваей рэлігійнай працы, як у сьвятынях, школах і інш., карысталіся роднай мовай сваіх верных.

VIII. Справа ўласнасьці.

§ 18. Грамадзкі парадак Беларускага Народу агулам павінен апірацца на прынцыпе прыватнай уласнасьці.

§ 19. Прыватная аднак уласнасьць павінна так быць ўрэгулявана і абстаўлена законам, каб ня была шкоднай агульна-грамадзкаму дабру.

§ 20. Побач уласнасьці прыватнай можа быць так-жа і ўласнасьць супольная (прыватна-грамадзкая, дзяржаўная), дзе гэтага хочуць

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Украінскі журналіст сярод Беларусаў у Вільні. 23—24 лістапада, будучы ў Вільні, украінскі журналіст Анатоль Курдыдык, дзеля абзнаямленьня з беларускім жыцьцём і паінфармаваньня абім украінскага грамадзянства, адведаў рэдакцыі беларускіх часапісаў („Б. Крыніца," „Калосьсе, „Шлях Моладзі," „Самапомач"), некаторыя беларускія грамадзкія і культурна-асьветныя арганізацыі і паасобных беларускіх дзеячоў.

У Цэнтральным Камітэце БХД. Прэзыдыюм ЦК. БДХ. на паседжаньні дня 4-га г. м. абгаварываў справу праектаванай абновы праграмы БХД, і пастанавіў праект праграмы падаць да публічнага ведама ў сваей газэце „Бел. Крыніца." Апрацаваны праект друкуецца ў гэтым нумары „Б. Крыніцы."

Лекцыя у Віл. Аддзеле БІГіК. У нядзелю 8-га сьнежня а гадз. 17-ай, у залі Інстытут пры Завальнай вул. 1—1, Д-р Малецкі прачытае канчатак свайго публічнага рэфэрату на тэму „Мы і наша бацькаўшчына" (аб гісторыі літаратуры, культуры і аб сучасным жыцьці Беларускага Народу наагул). Уход на рэфэрат вольны і бясплатны.

У Т-ве Беларусаведы. У нядзелю, 8 сьнежня, а 17 гадзіне у VI залі Унівэрсытэту адбудзецца навуковая зборка Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Унів. Сьцяп Батуры. На парадку дня: Разбор повесьці В. Адважнага „Хлапец." Уход вольны.

КУПЛЯЙЦЕ!

Беларуская Друкарня ім. Ф. Скарыны

Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў. Хто адразу купае ад 10 да 25 календароў, плаціць 40 гр., ад 25 да 100 календ.—плаціць 37 гр., 100-300— 35 гр., 300—1000 - 33 гр. за штуку. Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „П А Г О Н Я" Вільня, Завальная вуліца № 1—1.

Nawokał palityčnaha pracesu ŭ Waršawie

Užo treci tydzień adbywajecca ŭ Waršawie wialiki palityčny praces u sprawie zabojstwa min. Pierackaha, a nawokał hetaha pracesu razychodziacca hułkim recham wiestki ab učaśnikach pracesu — ukrainskich terorystach i ukrainskaj terorystyčnaj arhanizacyi OUN. Adtul dachodziać wiestki, što ukrainskija terorysty OUN karystalisia bombami niamieckaha pachodžańnia, a litoŭski ŭrad pamahaŭ ukrainskim terorystam kanspirawacca i hrašmi. Pry hetym dachodziać čutki, što OUN byccam mieła plany arhanizawać tajnaje biełaruskaje wojska. Ab hetym woś, za polskaj presaj, padajom i my.

OUN i Niamieččyna

Polskaja hazeta „Waršaŭski Dziennik Narodowy," u sprawie zabojstwa min. Pierackaha, piša: — rewalwery, bomby i inšaja zbroja, jakoj karystalisia ukrainskija terorysty OUN, byli niamieckaha pachodžańnia; u Niamieččynie stała prabywali kiraŭniki hetaj arhanizacyi; tam mieŭ prypynišča pałk. Kanawalec i inšyja kamandziery OUN.

Słowam, endeckaja presa mocna heta ćwierdzić, a mocna musić dziela taho, što ab hetym akt abwinawačańnia ničoha nia kaža.

Ukraina i Litwa

Waršaŭski „Kurjer Poranny" pad uražańniem pracesu piša: — chto systematyčna śladziŭ za raźwićciom ukrainskaj sprawy, toj wiedaje, što na płoščy litoŭska-biełaruska-ukrainskich intaresaŭ naśpiawaje niejkaje supracoŭnictwa j tajnaje zbližeńnie. Ad 1922 h. paŭstaje biełaruska-litoŭska-ukrainski blok i ukrainskija palityki jeździać na biełaruskaje narodnaje świata ŭ Wilniu i hetym pakazwajuć kirunak zacikaŭleńnia ukrainskaj palityki. U hetych časach praf. Biržyška, staršynia litoŭskaj arhanizacyi „Wyzwaleńnie Wilni," jedzie ŭ Ameryku i nawiazwaje kantakt z litoŭskimi i ukrainskimi hrupami na emihracyi. U hetym časie paŭstała ŭ Koŭnie „Litoŭska-Ukrainskaje T-wa.

„Tajnaja biełaruskaja armija"

U suwiazi z wyšejpadadzienym „Kurjer Poranny" maluje plany „tajnaj biełaruskaj armii."

„U światle hetakich faktaŭ—piša „K. P." — jość zusim zrazumiełymi dabytyja na dziennaje świattło plany OUN arhanizawać tajnuju biełaruskuju armiju i padniać joju paŭstańnie ŭ siaredniaj i paŭnočna-ŭschodniaj Polščy."

Litoŭskaje zapiarečańnie.

Litoŭskaje Telehrafičnaje Ahienstwa aficyjalna zajaŭlaje, što wiestki ab finansawańni i padtrymańni litoŭskim uradam ukrainskich terorystaŭ niepraŭdziwyja.

Ahułam, wodhuki Waršaŭskaha pracesu hromkija i šyroka razychodziacca. Hetyja wodhuki prachodziać nie biaz upływu na hramadzkuju apiniju. A jakuju hetyja wodhuki wytwarajuć apiniju ŭ polskim hramadzianstwie ab ukraincach, litoŭcach i ab biełarusach, my bačym z wyšej apisanaha.

p.

Kamitet 18-stki

U Lizie Narodaŭ paŭstaŭ specyjalny kamitet dziela wyrašeńnia spraŭ adnosna tasawańnia prociŭ Italii sankcyjaŭ. Apošnimi časami ŭ Kamitecie 18-stki (kamitet składajecca z 18 pradstaŭnikoŭ) abhawarywajuć sprawu zastasawańnia prociŭ Italii sankcyi h.zw. naftawaj.

Hetaja sankcyja dla Italii najbolš balučaja, ale jana i najbolš niebiaśpiečnaja — naftawaja sankcyja moža spynić wajnu ŭ Afrycy, ale moža pačać wajnu ŭ Eŭropie. Dziela hetaha ŭ hetaj sprawie ciapier naradžajucca anhielskija dyplamaty z dyplamatami francuskimi,— bo-ž jany ŭ zhodzie trasuć usim ciapierašnim palityčnym świetam.

Fašyzm i kamunizm u Francyi

Buržuaznaja, liberalna - demokratyčnaja francuskaja respublika ciapier znachodzicca ŭ połymi zaŭziataj baraćby miž h. zw. narodnym-socyjalistyčna-kamunistyčnym frontam i francuskaj fašystaŭskaj arhanizacyjaj „Ahniawy Kryž".

Ciapierašniaje pałažeńnie ŭ Francyi nadta-ž padobnaje da pałažeńnia ŭ Niamieččynie ŭ 1932 h., kali hrozna ŭzrastaŭ hitleryzm i pasiahaŭ pa ŭładu ŭ dziaržawie.

Francuskaja buržuaznaja intelihiencyja, jakaja ciapier trymaje dziaržaŭnuju ŭładu ŭ swaich rukach, sparaližawanaja moralnaj gangrenaj, dalej trymać kiraŭnictwa dziaržaŭnym aparatam užo nia moža. Dziela hetaha paŭstaŭ tam fašyzm, a prociŭ fašyzmu paŭstaŭ narodny-socyjalistyčna-kamunistyčny front.

Chto tam pieramoža, — pakaža niedalokaja budučynia. Ad raźwiazki hetaj francuskaj unutranaj baraćby fašyzmu z kamunizmam zaležyć takža ŭ mnohim i raźwiazka ŭ palitycy miždziaržaŭnaj.

Z palityčnaha frontu italijanska-abisynskaj wajny

My pisali' što italijanska-abisynskaja wajna nia tolki italijanska-abisynskaja, ale i italijanska-anhielskaja.

Kali Italija napała na Abisyniju, dyk Anhlija puściła zaržaŭlenuju mašynu Lihi Narodaŭ poŭnym chodam, kab patušyć pažar wajny ŭ Afrycy. Da hetaj pary Anhlija hladzieła na wojny, jakija praliwali kroŭ u Amerycy (Boliwija z Parahwajem) i ŭ Azii (zachwat Japonijaj kitajskich prawincyjaŭ), praz „palcy" i nia była takoj „miralubnaj", jak ciapier. Ciapier dziela ŭstrymańnia wajny ŭ Afrycy Anhlija pastarałasia, kab Liha Narodaŭ pastanawiła tasawać adnosna Italii sankcyi, a sama raźmiaściła swoj fłot na Sieradziemnym mory. Słowam, Anhlija ŭziałasia nie na žarty prociŭ Italii i starajecca, kab jaje pabili abisyncy ŭ Afrycy. Hetkaje stanowišča Anhlii ŭ sprawie italijanska abisynskaj wajny dla Italii wielmi ciažkoje i mahčyma, što italijancy hetaha ciažaru nia wydzieržać.

Prajekt miru

Anhielskija i francuskija „dabradziei", adny dla Abisynii, a druhija dla Italii, padajuć prajekt miru. Hety prajekt palahaje na padziele Abisynii — abisynskija ziemli, što lažać miž Erytrejaj i Somalijaj pieradajucca pad rasparadžeńnie Italii, h. zn. Italija mieła-b nad hetymi prawincyjami mandat. Italija na heta ŭžo hatowa zhadzicca, ale niama nadziei, što na hetaki mir zhodzicca Abisynija.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ"! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač", Wilnia — Wilno Połackaja Nr. 9—4.

Naša pošta.

J. P—ka. Atrymali, dziakujem, karystajem, pišycie čaściej.

Janka Dudka. Dziakujem za karespondencyju, skarystajem. Prysyłajcie wiestki ab žyćci ŭ Wašaj wakolicy raz na miesiac, dyk i šmat kaštawać nia budzie i karysna budzie.

Monič. Piśmo atrymali, prysłanaje pieradali ŭ Bieł. Nacyjanalny Kamitet.

Kryŭka. Wašyja wieršy da druku nie nadajucca, pišycie ab žyćci ŭ Wašaj wakolicy.

Dulka. Wam hazeta pasyłajecca akuratna, damahajciesia na pošcie Za karespondencyju dziakujem, pa mahčymaści skarystajem.

K—ku. Nijakaha padziełu na „hrupy" ŭ B.Ch.D. niama. Na jakoj padstawie hetyja wiestki pašyrajucca, — my nia wiedajem.

людзі і дзе гэтага вымагае агульна-грамадзкае дабро.

IX. Зямля.

§ 21. Зямля і ўсе прыродныя багацьці на Беларусі, на падставе прыроднага права, зьяўляюцца ўласнасьцяй Беларускага Народу.

§ 22. Валаданьне і карыстаньне зямлёй на Беларусі павінна быць апёрта на падставе права ўласнасьці (глядзі § 18).

§ 23. Прыватная зямельная ўласнасьць павінна быць урэгулявана так, каб ня шкодзіла агульна-грамадзкаму дабру (глядзі § 19).

§ 24. Вобак прыватных зямельных гаспадарак могуць існаваць і гаспадаркі колектыўныя, дзе гэтага хочуць людзі, а так-жа дзе гэтага вымагае агульна-грамадзкае дабро (гл. § 20).

§ 25. Найбольш адпаведнай формай прыватнай зямельнай гаспадаркі Б.Н.А. уважае гаспадарча-самавыстарчальныя хутары.

§ 26. Хутары павінны мець зямлі ня больш такой нормы, якой хапае на дастатнае выжыўленьне і культурнае ўтрыманьне сялянскай сям'і.

§ 27. Беззямельныя і малазямельныя сяляне зямлю атрымоўваюць бяз выкупу.

§ 28. Разрахунак за зямлю з ўласьнікамі праводзіць дзяржава.

§ 29. Арганізаваньне зямельных гаспадарак, а так-жа азначаньне колькасьці зямлі і варункаў яе атрыманьня праводзіцца адпаведнымі органамі, у паразумленьні з тымі, каторых гэта беспасрэдна датыча.

§ 30. Б.Н.А. імкнецца да пашырэньня і павялічэньня зямельна-гаспадарскай культуры.

§ 31. Б.Н.А. за справядлівыя цэны на прадукты сялянскія і фабрычныя: проціў выкарыстываньня вёскі местам і наадварот.

§ 32. Б.Н.А. проціў чужога асадніцтва на беларускіх землях.

X. Справы работніцкія.

§ 33. Для работнікаў фабрычных Б.Н.А. бароніць:

a) васьмі-гадзінны дзень працы,

b) права страйку, як абарону ад вызыскаў, і права праф-саюзаў,

c) калектыўныя ўмовы, дзеля забясьпечаньня лепшай аплаты,

d) забарону начной працы (вынятак там, дзе вымагаюць тэхнічныя варункі або грамадзкія патрэбы),

e) забарону працы шкоднай здароўю жанчыны,

f) забарону працы дзяцям у фабрыках неадпаведную іх веку,

g) нядзельны адпачынак.

§ 34. Б.Н.А. за праўную апеку над працоўнымі на зямлі, у фабрыках і над хатняй службай адумысловым уставадаўствам.

§ 35. Б.Н.А. бароніць усе дасюлешнія соцыяльныя і прафэсыянальныя здабычы работнікаў, а так-жа змагаецца за іх пашырэньне і далейшае разьвіцьцё.

XI. Адносіны між сялянствам, работнікамі і інтэлігенцыяй.

§ 36. Б.Н.А. за салідарнасьць сялян, работнікаў і інтэлігенцыі і ўсіх працоўных.

§ 37. Б.Н.А. проціў дыктатуры работнікаў над сялянамі і наадварот.

§ 38. Б.Н.А. імкнецца да таго, каб не пролетарызаваць грамадзян, але надзяляць іх уласнасьцяй: сялянскіх работнікаў надзяляць зямлёй, а фабрычных рабіць уласьнікамі фабрыкаў, а так-жа імкнуцца да таго, каб і фабрычных работнікаў надзяляць зямлёй, дзе-б яны маглі мець прынамся гарод і пабудаваць сабе хату.

XII. Коопэрацыя.

§ 39. Б.Н.А. за пашырэньне спажывецкай, вытворчай, гандлёвай, крэдытнай і інш. коопэрацыі (коопэратыўныя крамы, малачарні, аляярні, льнярні, пазычкова-ашчадніцкія касы і г.д.) і за поўную свабоду яе разьвіцьця.

XIII. Падаткі.

§ 40. Мерай падаткаў для промыслу і гандлю павінен быць даход. Дзеля гэтага, хто больш мае даходу, той прагрэсыўна больш плаціць і падатку. Сяляне плацяць залежна ад колькасьці і катэгорыі зямлі, а гараджане — ад сваей маемасьці. Катэгорыю зямлі ўстанаўляюць сялянскія камісіі пры самаўрадах, а ацэнку маемасьці ў гарадох — такія-ж камісіі складзеныя з гараджан.

§ 41. Б.Н.А. проціў падаткаў пасрэдных (укосных) на прадукты першай патрэбы, як на соль, газу, цукар і інш.

§ 42. Б.Н.А. за адзіны падатак, гэта знача за такі, які-б вызначаўся раз у год, з разлажэньнем на раты і з азначэньнем тэрміну.

§ 43. Даход патрэбны толькі на пражыцьцё павінен быць ад падаткаў зусім звольнены.

XIV. Суд.

§ 44. Суд павінен быць незалежны ад палітычных кірункаў і ад адміністрацыі.

§ 45. Ува ўсіх важнейшых крымінальных і палітычных справах прыгавары пастанаўляюцца судамі прысяжных.

§ 46. Б.Н.А. проціў кары сьмерці.

XV. Войска.

§ 47. Б.Н.А. змагаецца з палітыкай мілітарызму і ймкнецца да замены сталай арміі народнай міліцыяй.

240352

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Zwyčajnaja sesija Sojmu i Senatu. Dekretam Prezydenta z dnia 29 min. m-ca sklikana zwyčajnaja sesija Sojmu i Senatu. Sojm sabraŭsia na narady 5 h. m. i prystupiŭ da razhladańnia ŭradawaha budžetnaha preliminara na 1936-37 h.

Karteli ŭ rasparadžeńni ŭradu. U Polščy jość bolš 200 kartelaŭ i 108 kartelnych sajuzaŭ, u jakich zarhanizawany kapitały polskaha pradpryjemstwa. Hetak zarhanizawany kapitał dyktawaŭ ceny na swaju wytworčaść biezkonkurencyjna i dziela hetaha na fabryčnyja wyraby na rynkach była wysokaja cana. Ciapier urad prawodziačy haspadarčuju palityku zraŭnawažańnia cenaŭ dekretam padparadkawaŭ karteli pad nadzor dziaržaŭnych uładaŭ. Hetakim sposabam urad maje dasiahnuć abnižeńnia cenaŭ i ńa fabryčnyja tawary.

Pamiatnik J. Piłsudskamu. U Waršawie na pamiatnik marš. Piłsudskamu sabrana ŭžo 2.212.000 zł.

Z ZAHRANICY

Rewalucyja ŭ Brazylii zdušana. Kamunistyčnaja rewalucyja ŭ Brazylii, ab jakoj my pisali ŭ prošłym numary, zdušana. Pawadyry rewalucyi na karabloch moram uciakli niawiedama kudy.

Nowy statut dla Akademijaŭ Nawuk u Sawietach. Balšawickaja hazeta „Izwiestija“ padaje, što ŭ Sawietach wydany nowy statut dla Akademijaŭ Nawuk, pawodle jakoha hetyja nawukowyja ŭstanowy pawinny supracoŭničać z sawieckim uradam i budunć padparadkawany Radzie Narodnych Kamisaraŭ.

„Niamieččynie karyśniejšy padzieł Polščy, jak padzieł Sawietaŭ“. Berlinski karespandent hazety „Menčester Hordijanu“, piša: — niamiecki hienerał Zekt namahajecca pierakanać Hitlera ab patrebie naładžańnia dobrych suadnosinaŭ miž Niamieččynaj i Sawietami. Zekt ćwierdzić, što „Niamieččynie karyśniejšy padzieł Polščy, jak padzieł Sawietaŭ“. Zekt uważaje, što Niamieččyna ŭ Sajuzie z Sawietami pašyrycca na ŭschod koštam Polščy.

Francyja damahajecca ad Sawietaŭ spłaty carskich daŭhoŭ. Hazety padajuć, što ŭ francuskim parlamancie źjawiłasia sprawa, kab urad pačaŭ zyskiwać ad Sawietaŭ daŭniejšyja carskija daŭhi.

Пісьмы з вёскі

Аб забойстве Антона Беленко.

(*З Навагрaдчыны*).

У прошлым нумары „Беларускай Крыніцы“ зьмешчана клепсыдра, якой падаецца да ведама шырокіх працоўных масаў аб сьмерці маладога дзяцюка Антона Беленко. Падана так-жа, што беспасрэднай прычынай яго сьмерці ёсьць прастрэл нябожчыка камісарам двара Міроўшчына.

Забойства Антона Беленко прадстаўляецца гэтак.

Моладзь з вёскі Гірычы ходзіць на заработкі ў двор Міроўшчыну. Хадзіў на заработкі, разам з іншымі, так-жа і Антон Беленко. Заработкі марныя. Апошнімі, прад забойствам Беленко, днямі падзёншчыкі працавалі пры паравой малатарні — малацілі збожжа. Праца цяжкая. За гэтую цяжкую працу 23 лістапада сёлета раніцай работнікі зажадалі ад дворнага камісара падвышкі заработнай платы. На гэтае справядлівае і законнае дамаганьне работнікаў камісар адказаў адмоўна. Пасьля адмоўнага адказу дворнага камісара, работнікі завярнуліся ад працы і ськіраваліся дамоў — пры машынах малатарні ніхто не астаўся. Камісар злосна, з пенай на вуснах і з рэвальвэрам у руцэ, сунуўся да работнікаў, абзываючы іх „бунтаўшчыкамі“, „бальшавікамі“ і ў гэты момант, ударыўшы кулаком работніка Воргана, стрэліў з рэвальвэра ў Антона Беленко. Куля папала ў бок, вышэй паясьніцы, і прайшла на вылёт. Сьмяротна ранены Беленко бязпрытомна паваліўся. Пасьля крыху апрытамнеў. У стане безнадзейным адвезьлі яго ў Навагрaдак у шпіталь, дзе ён увечары памёр.

Вось рэзультат благіх адносінаў дворнай прыставы да работнікаў. Гэты дзікі паступак дворнага камісара паказвае, што суадносіны дворна-вясковыя вельмі напружаныя. Можна вырашаць іх справядлівай зямельнай рэформай — надзяленьнем поўназямельнымі гаспадаркамі малазямельных і беззямельных сялян, каб яны, сяляне, не патрабавалі пабочных заробкаў у двары.

Сьлёзнавокі.

Ab škole.

Lachawičy, Baranawickaha paw. Jość u nas škoła, ale polskaja. U hetaj našaj 7 addzieławaj škole wučacca biełaruskija dzieci. Polskich dziaciej u nas amal niama, bo polskija ŭ nas čynoŭniki i asadniki dziaciej šmat nia majuć. Biełaruskija dzieci ŭ škole haworać miž saboj tolki pabiełarusku, bywaje, što zwaročwajucca jany pabiełarusku i da wučyciela. Wučyciali ŭ našaj škole zabaraniajuć dzieciam hawaryć pabiełarusku, bo našaja škoła ŭważajecca čysta polskaja.

Baćki, treba damahacca dla našych dziaciej rodnaj škoły, h. z. kab našych dziaciej wučyli pabiełarusku.

Baćka.

Piśmo ŭ hazetu „Biełaruskaja Krynica“ z wioski Pohiry, Dziatłaŭskaj woł., Nawahradzkaha paw.

Našaja wioska wialikaja — maje kala 220 chataŭ. Żywuć u joj adny biełarusy, pa wiery — napaławinu — prawasłaŭnyja i kataliki. Jość u nas polskaja škoła, — maje čatyry addzieły. U hetaj škole wučycca našaja moładź, jakaja chodzić tudy praz čatyry hady i bolš, a paśla astajecca niahramatnaj.

Wioska našaja razlohšysia kala haścinca (balšaka), jaki wiadzie z Dziatława praz Bielicu ŭ Lidu. Čyhunačnaja stancyja Nowajelnia ad nas 12 kilametraŭ. Našaja wioska dawoli pramysłowaja — jość u nas swaje kawali, kraŭcy, šaŭcy, stalary, jość i swaje muzykanty, jość u nas i kramy, jość i swaje cieśli. Niama ŭ nas swajej arhanizacyi i hetyja ramieśniki ziemlaroby nia ŭmiejuć pracawać supolna dziela pašyreńnia kultury i dziela ahulnaha, supolnaha dabra. Moładź našaja prosta hibieje. Zabaŭlacca kulturna nia ŭmieje. Ihryščy adbywajucca tolki z harełkaj — pjanaja moładź tady padobnaja da dzikunoŭ. Niekatoryja ŭważajuć za bolš karysnaje prapić załatoŭku, čymś za jaje wypisać hazetu. Hetkich „filozafaŭ“ užo nia šmat, ale jašče jany nie źwialisia. Našaja moładź mocnaja narodnym ducham — u polskuju arhanizacyju nia jdzie i polonizacyi nie paddajecca.

Moładź našaja ŭ sprawie relihijnaj adstaje — adchilajecca i ad carkwy i ad kaścioła. Dy j nia dziwa, bo i ŭ carkwie i ŭ kaściele dla našaj moładzi čužy duch — u carkwie rasiejski, a ŭ kaściele polski.

Dwaroŭ kala nas hetulki, jak by ich chto nasiejaŭ, — kudy ni hlań, usio dwornyja ziemli, lasy, łuhi, prastory. Pobač z hetymi dwarami siadziać ubohija biełaruskija wioski, u jakich poŭna ludziej-ziemlarobaŭ, katoryja žywuć z zarabotkaŭ u hetych dwaroch, bo swajej ziamielki nadta mała — 2—3 hektary na wialikuju siamju. Zarabotki ŭ dwaroch marnyja — pa 1 zł za dzień pracy dla mužčyny i pa 70—80 hr. dla žančyny.

Patrebna ŭ nas nieadkładna ziamielnaja reforma. Treba dla małaziamielnych i biezziamielnych ziemlarobaŭ nadziełu ziamli, bo jnakš našyja wioski dalej žyć i raźwiwacca nia mohuć.

Hadoŭ 7 tamu była ŭ nas arhanizacyja T.B.Š. Tady jašče nia było haspadarčaha kryzysu i žyłosia krychu lepš. Tady ŭ našaj wioscy ładzili biełaruskija pradstaŭleńni i było wiesialej žyć. Ciapier štoraz horš žywiecca.

Wot jakoje žyćcio-byćcio našych ludziej ciapier. Sumnaje žyćcio, asabliwa moładzi. Darahaja moładź, kiń harełku pić i nie pudrujsia! Biarysia za samaadukacyju — wypisywaj hazety, knižki, čytaj ich i hetak praświačajsia.

Hora.

U sprawie abnowy B.Ch.D.

Na zaklik Prezydyjumu C. K. B.Ch.D. u 39 numary „Bieł. Krynicy“ 1935 h. u sprawie źmieny nazowu B.Ch.D. ja padaju swoj hołas za nazoŭ „Biełaruskaje Narodna-Radykalnaje Abjednańnie“ (B.N.R.A.). Dobry nazoŭ tak-ža i „B.N.A.“, ale moža nie abznajomlenamu tady zdasca, što hetaja arhanizacyja konserwatyŭnaja. Na moj pahlad, treba, kab abnoŭlenaja B.Ch.D. abymała šyroka swajej prahramaj i nazowam biełaruskija sprawy i hetak złučała-b mahčyma najbolš dziejnych biełarusaŭ.

Ja rašuča prociŭ nazowu „B.N.R.P.“, bo naš narod nia lubić partyjaŭ i partyi majuć adjemnuju rysu swajho charaktaru ŭ tym, što jany zabojča zmahajucca za partyjnyja dohmy pakidajučy na baku sprawy hałoŭnyja.

J. P—ka.

Гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

Ці вы ўжо ўпарадкавалі свае бібліятэкі?

Ці папоўнілі іх новымі кнігамі?

Ці сабралі кніжкі ад прыяцеляў і знаёмых?

Ці зрабілі шафкі на кніжкі?

Ці завялі сыстэматычнае пазычаньне кніжак?

Wincuk Adważny 4)

Hanuliny kłapoty

ČAŚĆ II.

IV.

Tut Antola nalacieła,
Za swajo ŭziałasia dzieła:
Razlatałasia pa chacie, —
To adnu reč ŭ ruki chwacie,
To druhuju... zawarožyć
Na wadzie; kampres pryłožyć,
Kuryć ziołki... Znaje dzieła!
Chworaj zara palachčeła.
To była babula trezwa:
Bojka, sprytnaja i rezwa;
Kaliś byŭšy za chmistryniu —
U ksiandza za haspadyniu.
A zamowy dobra znała:
Ŭmih ŭsie čary adrablała!
Chto-b niahodny, krywa-woki
Kinuŭ złosnyja uroki, —
Jak wadoj Antola zmyła,
Prapadała ŭraža siła.
Pamahała ludziam duža:
Ci to skuła, ci to ruža
Ci to hadzina ukusić,
Jak zamowić, zara zmusić
Da uciečki ducha złoha,
Taho woraha ludzkoha.
Choć i mała mieła duchu,
Była bojkaja, psiajucha!
Woś Antola, jak prystała,
Zara praŭdy dapytała;
I pryčynu znajšła skora:
Jak, čamu Hanula chwora?
Niechta hlanuŭ krywym wokam,
I darohaj lewym bokam
Išła, biednaja, nia znała,
Što niaščaście tam čakała.
Pośle kinuła na karty
I paznała, čaho warty: —
Byli drenny, złyja wočy;
Abiacała sierad nočy
Adrabić astatnia licha.
„Tolki, kaža, budźcie cicha!
Kab paznać, chto winawaty,
Treba wykinuć ŭsio z chaty
Moža jość tut što čužoje?
Ci wialika, ci małoje —
Kaža,—won usio dačysta!
Kab sumleńnie było čysta.“
Tut, chto spomniŭ, što čužoje,
Dyk Antola brała toje:
Jak što drenna wykidała,
Lepša...—ŭ pazuchu chawała.
Paŭluk pieršy prynios puhu,
Wudu, nožyk i padpruhu,
Što niadaŭna byŭ ukraŭšy
I pad belkaj prychawaŭšy.
Woś Antola nakiwała
Pad nos chłopcu, wušy drała
I swaryłasia strašenna,
Što rabiŭ tak, šelma, drenna.
Na kawałki wudu rwała,
Reštu won pawykidała;
Tolki nožyk niaprykmietna
U kiašeń pajšoŭ sakretna.
Pośle biednaja Michasia
Ledźwie z ducham sabrałasia —
Jak na spowiedzi skazała,
Hdzie čužoje što schawała:
Była stužka adna, špilka,
Što zabyłasia Marylka,
Jak była da ich pryjšoŭšy.
Bolš čužoha nie znajšoŭšy.
Addała Michasia heta.
—„Nu, a ty skažy, kabieta:
Moža maješ što takoje?“
Tut Hanula ŭspomnić toje,
Što znajšła ŭ darozie hrošy...
„Woś hdzie worah byŭ najhoršy!
Tut Antola zakryčała:
Rukoj hrošy nie čapała,
A ŭziała ich ŭ rukawicu.
Zapaliła tut hramnicu,
Doŭha niešta čarawała
I... za pazuchu schawała.

V.

Zaŭtra rana, niewiasioła,
Pryjšła Hanna da kaścioła.
Tut jakraz joj napatkaŭsia
Dzied kaścielny. Prywitaŭsia.
—„Što čuwać?“Dyj, kaža, cicha:
„Ni dabra niama, ni licha.“
—„A, waspani, jak žyłosia?
Kryšku čuŭ: nie udałosia...
Jak-ža metryku dastała?“
— «Kab jana nie dačakała!
Niehdzie zhinuła, praklata.“
Hanna plunuła zaŭziata:
Złość jaje apanawała:
Bo ŭžo dosyć harawała —
Dla papierki, treba-ž heta!
Čysta zmučyłaś kabieta.
Dzied — pawažnaja figura,
Zwaŭsia jon Michał Batura —
Byŭ nabožny i surowy.
Hlanuŭ wostra, zmorščyŭ browy,
—„Ty,—joj kaža—nie klanisia,
Lepiej kajsia i malisia.“
Byŭ jon dzied z dziadoŭ tym znakam,
Šmat hadoŭ z wialikim hakam;
Piać hadoŭ mieŭ na pačatak
Až na wośmy ŭžo dziesiatak.
Byŭ-ža jon dziadok sumlenny:
Abawiazak, choć i drenny,
Wypaŭniaŭ stary, jak treba —
Nie dla chleba, a dla nieba.
Słužyŭ ščyra Panu Bohu:
Nie adchodziŭ ad parohu,
Ad kaścielnaha nikoli.
Hora bačyŭ tož dawoli.
—„Sieło, kaža, ty durnoje!“—
Babie dzied kazaŭ na toje:
—„Čaho łaziš ŭ tuju hminu?“
—„Dastać treba „dowid“ synu“
—„Dowid, kažaš? ech ty, dura!“—
Kazaŭ dzied, Michał Batura:
„A nia pomniš ty na toje,
Piša što Piśmo Światoje?
„Pomni, durniu, što biaz Boha
Nie dalezieš da paroha!
Pačni z Boham swaje sprawy,
Budzie Boh tabie łaskawy.
Pomni toje, majo dzietka,
Što ŭsio kručana — nia krepka.
Što krucielstwam świet piarojdzieš
Dy nazad nijak nia dojdzieš!
A ty, baba, šmat nałhała,
Jak toj metryki šukała...
Da ksiandza iznoŭ źwiarnisia:
Budź ciarpliwa, nie śpiašysia.
Jon, choć dobry, nie paśpiešny,
I bywaje časam śmiešny:
Pačynaje razoŭ dziesiać,
Pośle ciahnie cełv miesiac.
Dyk ty śmieła pryčapisia,
Cełv dzień nie adstupisia:
Horkaj redźkaj jak dakučyš,
Jaho dobrańka prymučyš,
Choć zapłaciš jamu skupa:
Jon napiša da biskupa,
Dašć prysiahu, sud toj zrobić,
Sam na hetym nie zarobić:
Łotać budzie z dźwiarej ŭ dźwiery,
Šmat papeckaje papiery,
Joj zapchaje ŭsie prystołki;
Tabie-ž metryku z ihołki
Dašć, jak treba, pieršaj klasy!
Da papieraŭ wielmi łasy
Naš ksiandzočak; dobry duža,
Jak umieje Bohu słužal..“

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič